ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 18 (992) | АЎТОРАК, 12 снежня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ПРАФЕСАР М.В.СЕЛЬКІН – СЯРОД ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ АД ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

28 лістапада ў памяшканні грамадска-культурнага цэнтра г.Гомеля адбылося пасяджэнне дэпутатаў базавага ўзроўню вобласці, на якім прысутнічалі таксама кіраўнікі раёнаў, гарадоў, буйных структурных падраздзяленняў, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэферэндумаў Л.М.Ярмошына і Старшыня Савета Рэспублікі П.У.Шыпук. Былі абмеркаваны кандыдатуры ў члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога скліканя па Гомельскай вобласці, заслуханы іх праграмныя выступленні.

У выніку тайнага галасавання ў верхнюю палату Беларускага парламента абраны старшыня аблвыканкама М.Р. Вайцянкоў, дырэктар СШ №13 г.Жлобіна К.В.Гузава (дарэчы, выпускніца матэматычнага факультэта нашага універсітэта), дырэктар камунальнага сельскагаспадарчага унітарнага прадпрыемства "Брылёва" А.Т. Кобрусеў, галоўны ўрач Хойніцкага тэрытарыяльнага медаб'яднання В.І.Кабылка, дырэктар Мазырскага камунальнага унітарнага прадпрыемства "Трыкатажная фабрыка "Славянка" Л.Я.Круцько, генеральны дырэктар рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Вытворчае аб'яднанне "Беларуснафта" У.В.Муляк, рэктар нашага універсітэта М.В.Селькін і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання П.У.Шыпук.

◆ ◆ ◆

**Калектыў універсітэта горача віншуе Міхаіла Васільевіча Селькіна з яго выбраннем у верхнюю палату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання і жадае яму творчай і плённай працы ў беларускім парламенце.**

## ЗА ВЫДАТНЫ ЎКЛАД У РАЗВІЦЦЁ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Распараджэннем кіраўніка дзяржавы ўстаноўлены на 2000-2001 навучальны год персанальныя надбаўкі 100 навукова-педагагічным работнікам ВНУ.

Персанальныя надбаўкі будуць выплачвацца штомесяц у памеры 30 тарыфных ставак першага разраду на асноўным месцы працы.

Кандыдатуры для ўстанаўлення надбавак абмяркоўваліся і вылучаліся саветамі вышэйшых навучальных устаноў і калегіяй Міністэрства адукацыі па выніках іх прафесійнай дзейнасці за апошнія тры гады па крытэрыях, зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 жніўня 2000 г. № 472.

Сярод узнагароджаных — педагогі і вучоныя, якія дасягнулі выдатных вынікаў у навучальнай, метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці, у падрыхтоўцы спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі Беларусі.

Ад нашага універсітэта персанальныя надбаўкі будуць атрымліваць загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання, доктар тэхнічных навук, прафесар І.В.Максімей і загадчык кафедры беларускай мовы, доктар філалагічных навук, прафесар А.А.Станкевіч.

## ЖЮЛИ КАНТИНО – РУСИСТ ИЗ БЕЛЬГИИ



"Меня зовут Жюли, я приехала из Бельгии, хочу изучать русский язык", — просто и открыто представилась девушка, придя на кафедру по направлению отдела международных связей.

Мы разговорились, и вскоре я узнал, что Жюли учится на 3 курсе факультета переводчиков университета в г.Монсе, недалеко от Брюсселя. Конечно, сразу возник вопрос: что ее привело в Гомель, как она здесь оказалась? Дело в том, что еще будучи школьницей, шесть лет назад она приезжала в Гомель по линии благотворительной организации "Прием Чернобыля". А до этого она познакомилась и подружилась с юным гомельчанином Андреем, который годом ранее проводил в ее семье летние каникулы. Вот и оказалась Жюли в далекой и чужой для нее стране в семье, с которой сблизила ее чернобыльская беда. После этого взаимные визиты были неоднократно, и теперь она приехала в Гомель к людям, которые стали для нее близкими. В общем-то, именно из-за трудностей в общении с новыми друзьями, из-за желания овладеть русским языком для Жюли не было проблемы выбора: както вполне естественно она оказалась студенткой переводческого факультета, где приходится много и упорно (кроме еще одного иностранного языка — английского) изучать такой непростой и такой замечательный язык — язык Пушкина и Толстого, Тургенева и Чехова, Блока и Есенина... Она живо интересуется всем тем новым, что пришло в русский язык в связи с коренными изменениями в нашей жизни. "Это так важно для переводчика!" — говорит Жюли. Ей интересны наша история и культура, наши традиции и обычаи, наши люди — с их непростыми проблемами и заботами.

Для бельгийских студентов это обычное дело — поехать в страну, где живут носители изучаемого языка, чтобы совершенствовать свои знания, стажироваться. Так что идея пройти стажировку на нашей кафедре, которая уже имеет достаточный опыт преподавания русского языка как иностранного, возникла отнюдь не случайно. С конца октября Жюли вместе со студентами-филологами посещает занятия по выбору, а главное — проходит индивидуальную стажировку под руководством одного из наиболее опытных преподавателей кафедры — доцента Е.И.Холявко.

**В.КОВАЛЬ.**
**зав. кафедрой русского, общего и славянского языкознания, доктор филологических наук.**
**Фото В.Чистика.**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На лістападаўскім пасяджэнні Савета універсітэта па дакладу намесніка старшыні прыёмнай камісіі прафесара С.Ф.Каморнікава абмеркаваны вынікі сёлетніх уступных экзаменаў у ГДУ і задачы па арганізацыі набору на новы навучальны год.

Аб рабоце аддзела міжнародных сувязяў далажыў яго начальнік дацэнт У.А.Сізоненка.

Да ўвагі членаў Савета была даведзена пастанова калегіі Камітэта Дзяржкантролю краіны аб арганізацыі харчавання навучэнцкай моладзі.

Па пералічаных пытаннях парадку дня прыняты адпаведныя рашэнні.

На пасяджэнні Савета былі разгледжаны кадравыя і некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ЧЭМПІЁНАЎ ПАВІНШАВАЎ РЭКТАР

Нядаўна ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося ўшанаванне зборных каманд універсітэта па футболу і валейболу, якія сталі чэмпіёнамі Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў 2000 года.

У валейбольнай каманды гэта перамога асаблівая — яна першая на такіх спаборніцтвах. Футбалісты вярнулі сабе тытул чэмпіёнаў пасля доўгага перапынку.

З уступным словам аб багатых традыцыях і высокіх дасягненнях у спорце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта выступіў рэктар, прафесар М.В. Селькін. Ён павіншаваў студэнтаў - членаў зборных каманд ГДУ па футболу і валейболу, пажадаў ім далейшых спартыўных перамог і поспехаў у вучобе.

Кожнаму спартсмену была ўручана грашовая прэмія. У сваю чаргу каманды ўручылі рэктару мячы з памятнымі аўтографамі сваіх ігракоў.



Будзем спадзявацца, што пакладзены пачатак добрай традыцыі.

**А.РАДЗЕВІЧ,**
**інстуктар-метадыст спартыўнага клуба ГДУ.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## ЗНАК ШЫРОКАГА ПРЫЗНАННЯ

На працягу трох дзён у МДУ імя М.В.Ламаносава праходзіла міжнародная сесія алгебраічнага семінара, якая прысвячалася 70-годдзю з дня яго заснавання.

Семінар быў створаны па ініцыятыве выдатнага савецкага матэматыка і палярніка, акадэміка, Героя Севецкага Саюза Отта Юльевіча Шмідта.

На гэты раз форум навукоўцаў сабраў шырока вядомых алгебраістаў не толькі з краін СНД, але і далёкага замежжа — Францыі, Германіі, Кітая, Польшчы і інш. У яго рабоце прыняў удзел і ганаровы рэктар нашага універстэта, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў. На пленарным пасяджэнні ён выступіў з дакладам, у якім прааналізаваў вынікі асабістых даследаванняў.

Неабходна сказаць, што Л.А.Шамяткову было аказана ганаровае права старшынстваваць на адным з пасяджэнняў. Гэтым самым была зазначана даніна павагі Гомельскай алгебраічнай школе, якую ўзначальвае Леанід Аляксандравіч.

Дарэчы, Л.А.Шамяткоў з"яўляецца вучнем акадэміка С.А.Чуніхіна, які ў сваю чаргу быў выхаванцам О.Ю.Шмідта — ураджэнца г.Магілёва.

Гомельская алгебраічная школа пад кіраўніцтвам Л.А. Шамяткова паспяхова працягвае і развівае матэматычную спадчыну О.Ю.Шмідта.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## КАНТАКТЫ ЎМАЦОЎВАЮЦЬ МАТЭМАТЫКІ

У Новасібірскім акадэмгарадку адбыліся традыцыйныя міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці выдатнага расійскага матэматыка акадэміка А.І.Мальцава.

Ад Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны ўдзел у іх прынялі і выступілі з дакладамі на секцыі алгебраістаў кандыдаты фізіка-матэматычных навук начальнік навукова-даследчага сектара В.Р.Сафонаў і В.М.Селькін.

Падчас знаходжання ў сваіх калег В.Р.Сафонаў ад імя ГДУ падпісаў дагавор аб творчым супрацоўніцтве з Інстытутам матэматыкі імя С.Л.Собалева Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук.

## *З узнагародай!*

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі кандыдат гістарычных навук, дацэнт **КАЧАТКОЎ** Уладзімір Іванавіч узнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## *ВІНШУЕМ!*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры оптыкі КУРЫЛКІНУ Святлану Мікалаеўну з прысуджэннем ёй Прэзідыумам БелВАКа вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.*

* * *

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства горача віншуюць асістэнта МІХАЛЧАКІНУ Тамару Анатольеўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.*

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА



Кацярына КАРАТЫШ,
студэнтка гр.Б-22
філалагічнага
факультэта.

*К.Каратыш – у паэзіі не навічок. Пісаць вершы пачала яшчэ ў дзяцінстве, першая яе публікацыя з'явілася ў раённай газеце "Лунінецкія навіны", калі яна вучылася ў 10 класе. Вершы дзяўчыны – прызнанне ў любві да родных прыгожых мясцін, што на Брэстчыне, да матчынай беларускай мовы, аб светлым пачуцці – каханні.*



### МОЙ РОДНЫ КРАЙ



Мой родны край з
жытнёвым полем,
З рачулкай поўнаю
вады
І з песняй-птушкаю на волі
Я зноў вяртаюся сюды.
Ах! Як прыгожа ўсё навокал:
Усё жыве, усё расце,
А ля бацькоўскіх родных вокан
Чаромха белая цвіце.
Люблю на досвітку прачнуцца,
Каб паглядзець на сонца ўсход,
Каб з галавою акунуцца
У новы дзень падзей-прыгод.

### РОДНАЕ СЛОВА



Песняры беларускага слова,
У вашых вершах віруе жыццё.
Чуем мы сваю родную мову
І мільённае сэрцаў біццё.
Ходзіць там па жытнёваму полю
Беларусь у вянку з васількоў.
Колькі ж іх вылятае на волю,
Быццам птушак, пяшчотных слоў!
Зноў галлём ля акенца хаты
Маладыя бярозкі шумяць.
Мова родная, як ты багата,
Твае словы праз сэрца гучаць.
Нам не трэба нічога чужога,
Няхай будзе ўсё, як ёсць,
Каб не страцілі слова святога,
Захавайце ў душы прыгажосць.

### НАСТАЎНІКУ



Настаўніка цяжкая
праца
Малечу ўсяму навучыць:
З павагай да кнігі звяртацца
І роднае слова любіць.
А мы разумець не хацелі,
Што гэта патрэбна ўсім нам
І ў думках кудысьці ляцелі,
Чароўным паддаўшыся снам.
За годы цяжкія вучобы
Мы працы пазналі той плён
І просім у вас прабачэння
За безліч азмрочаных дзён.
Вяртацца ў дзяцінства хацелі –
Бягуць за гадамі гады.
А вы, хоць ужо пастарэлі,
Душою заўжды малады.
Настаўніка цяжкую працу
Вучыся з дзяцінства цаніць:
З павагай да кнігі звяртацца
І роднае слова любіць.

### КАХАННЕ



Ты не бачыш майго
кахання:
Ну, канешне ж, яно празрыстае,
Яно птушкай узляціць на світанні,
Яно цёплае, светлае, чыстае.

Я раней цябе не сутракала
І ў чароўным не бачыла сне.
Раптам постаць твая паўстала,
Запаліла агонь у ва мне.

Як прыемна салодзіць душу
Усплёск прыгожага пачуцця.
І кахаць я, канешне ж, мушу,
Бо няма без кахання жыцця.

### ПОРЫ ГОДА



*Люблю вясну я
ў канцы мая,
Калі ўсе дрэвы ў
белай квецені наўкол,
Калі жаўрук у небе весела спявае
І ўжо зялёнай траўкай маладой
засланы дол.
Вясной прырода вочы адкрывае
Ад доўгага зімовага ўжо сну,
Усё вакол цвіце прыгожа і спявае,
Зноў сустракае радасна вясну.*

...



*Прайшла вясна
– пара настала
лету
З прыемным пахам
ягад і
грыбоў.
У поле выйдзеш – колькі розных
кветак:
Рамонкаў белых, сініх васількоў!
Дзень цёплы пройдзе і настане
ціхі вечар,
І заспявае салавейка ў цішыні.
Узыйдзе ў небе ясны месяц на
сустрэчу
Да зорак, што блішчаць у вышыні.*

...



*Паволі восень залатая
падыходзіць,
Фарбуе ў жоўты
колер дрэвы і кусты.
Дажджы з вятрамі за сабою яна
водзіць,
Што зямлю кропяць, абрываюць з
дрэў лісты.
У садзе грушы зноў і яблыкі
паспелі,
Гараць чырвоным полымем галінкі
у рабін,
У вырай ластаўкі, шпакі ўжо
адляцелі,
А вунь над лесам ледзь відаць
гусіны клін.*

...



*Зірнеш у акно
зімовым светлым
ранкам:
Снег на бярозе
срэбрам заблішчыць.
На дворык выйдзеш, сыдзеш ціха
з ганка –
Сняжок пушысты пад нагой рыпіць.
Прыйшоў марозік з
зімкай-чараўніцай,
Скаваў ён рэчкі тонен ькім лядком.
Усё блішчыць на сонцы, весела
іскрыцца
І засцілаецца бялюткім снегам,
як пушком.*



*Владимир ГРИЦКОВ*

### ОСЕНЬ

*Холодной осенью
Выглянул луч солнца,
Остановился и исчез,
И между тучами неба оконца,
Пожухла трава и осунулся лес.*

*Ветер порывами листики сносит,
В ветвях деревьев шумит,
Осень без спроса приходит
В гости к тебе погостить.*

*Утром опавшие листья
Шуршат под ногами опять,
Словно забытые письма
Я собираюсь читать.*

*В небе просвета не видно,
Кругом одни облака.
Осень пришла и обидно,
Что больше не будет тепла.*

## Зарисовки с натуры

Какой замечательный у нас город! Светит яркое солнышко, природа дышит полной грудью, пытаясь вдохнуть последние ароматы бабьего лета.

Превратимся в наблюдателей-невидимок. По улицам, домам, прохожим будут скользить лишь наши взгляды. Начнем.

Впереди идет девушка, утреннее солнышко, несмело поднимающееся над горизонтом, отражается в ее глазах. Она идет и улыбается, сощурив глаза и слегка запрокинув назад голову, подставляет свое личико нежному ласковому солнышку. Девушка расстегнула плащ. Засунув руки в карманы, она поднимает их вверх, отчего широкие полы плаща превращаются в крылья.

Навстречу ей из тени появляется человек. Седой. В кожаной куртке. Ему холодно. Куртка застегнута до самого верха. Голова втянута в плечи. В глазах какая-то тяжелая мысль. Она давит на него. Мысль. Не одна. Их много. Каких-то неприятных. Эти мысли изменили его еще красивое лицо, превратили в нечто мрачное, ужасное. Он смотрит на девушку. Цепляется за нее, будто пробуждается, выходит из задумчивости. Пытается обострить свое внимание. Мученически провожает ее взглядом. Ничего не понимает. Вдруг, окончательно проснувшись, прибавляет шаг. Все быстрее и быстрее. Все дальше и дальше удаляется он от девушки. Бежит от нее прочь.

Посмотрите направо, здесь продают цветы: гвоздики, розы и множество других. Какая неосторожная девушка. Ее, видимо, захлестнуло любопытство, если она, не боясь, идет между торговцев цветами.

— Цветы, девушка, покупайте цветы! Какие вам показать? Посмотрите, какие они свеженькие? Девушка, вам какие? Бордовые лучше или... — доносится со всех сторон.

## СРЕДИ ЛЮДЕЙ

Поглядите вперед. Стоят бабушки с сумками.

— Сигареты, сигареты. Девушка, купите сигареты.

Милые старушки кружат как стервятники и призывают молодежь к курению. Глядите: со стороны магазина, из-за угла бежит одна из таких бабушек.

— Фрося! Фрося! — кричит она, выжимая весь воздух из легких.

Вот это да! А ведь наши бабушки, только что стоявшие с пачками сигарет, рассыпались среди людей. И никто уже не заглядывает в глаза с заговорщицким видом, предлагая купить сигареты. Странно, не правда ли?

А вот и причина внезапного исчезновения старушек. Из-за того же угла появились три милиционера. Они идут и постукивают резиновыми дубинками по ладоням, самодовольно озирая людей.

...А теперь пойдем в парк.

Простите мне одну глупость. Гуляем мы с вами уже давно и, как любому человеку, мне нужно зайти в место общественного пользования...

Ну, вот и я. Мне даже выдали квитанцию, в которой учитывается НДС, то есть налог на добавленную стоимость. Интересно, за что?

В парке бродят цыганки, предлагают рассказать все, что было и все, что будет. Впереди идет группа девушек. О чем-то спорят, смеются. Их догоняет какой-то парень с криком: "Зоя! Зоя, подожди!" Подбегает к одной из девушек, хватает ее за руку. Вдруг в испуге отступает и говорит: "Простите, ошибся". Опускает голову и отходит. Эта девушка и ее подруга останавливаются: камешек попал в туфлю. К ним подходит цыганка.

— Дай, красавица, погадаю. Всю правду скажу, по глазам вижу: не от Бога страдаешь, от женщины. Хочешь, имя твое скажу? Зоей тебя зовут, золотая ты моя.

Девчонки прыснули смехом и пошли своей дорогой, оставив цыганку в недоумении.

И все-таки, какой здесь замечательный воздух: сладкий немножко, легкий, ощущаешь некоторую свободу. Только золотые листья навевают некоторую печаль, несколько торжественную.

Пора возвращаться, вы не устали?

Автобус. Заходим. Душно и тесно. За окном проносится все виденное нами за сегодняшний день. Парк. Бабушки. Цветы. Улицы...

**Елена ДУБИНИНА,
студентка 3-го курса
физического факультета.**

**Аксана БЯРЭШЧАНКА,
студэнтка гр.БА-33 філфака.**

### БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯЎЧЫНА

*Па сцяжынцы ішла дзяўчына
Ці анёл, ці чараўніца.
Не ішла – плыла па ветры.
Я спыніўся падзівіцца:*

*Некранутай прыгажосці
І цнатлівай чысціні.
Вочы, як блакіт нябёсаў,
Залатыя валасы...*

*Чырвань вуснаў, срэбрам голас,
Песні дзіўныя пяе.
Тонкі стан, нібыта колас.
Дабрыня вакол яе.*

*Не ішла – плыла па хвалях
Невычэрпнае красы,
Травы сцежку высцілаюць,
Кветкі хіляць да нагі.*

*Ці анёл, ці чараўніца...
Зразумець тут не магчыма.
Толькі вось яна, паночкі,
Беларуская дзяўчына.*



**Тимофей ЕЖОВ,
студент гр.А-41
факультета иностранных языков.**

### ОСЕННЯЯ ПЕСНЯ

*Я – не наивный тот мальчик,
шепчущий злыми губами:
"В мире все будет иначе,
если меня вдруг не станет".
Я ни о чем не жалею,
я обо всем забываю.
Осень; наверно, старею.
Осень, ну с кем не бывает.
Осень. По первому снегу
бродят вчерашнего тени.
Я – обнаженное это
всех моих прошлых стремлений.
Скучно. Дымлю сигаретой
в небо, набитое ватой.
Это уже было где-то,
с кем-то, зачем-то, когда-то.
Однообразие песен
и монотонность мелодий: —
все остается на месте,
даже когда мы уходим.*

*Я покидал твое крыльцо –
напрасно, мама:
в мой полусон твоим лицом
сочится память.*

*Все тяжелее засыпать,
как будто осень
как ты, присевши на кровать,
остаться просит.*

*Туда, в закат, за горизонт,
пылавший шрамом,
я убегал искать свой дом –
все тщетно, мама:*

*сколь не дарило мне огня
другое солнце,
но нету дома для меня
за горизонтом.*

*Предупреждал меня хрипя
вдогонку ветер:
"Не будет дома для тебя
на целом свете".*

*Но ночь стелила простыней
небес огромных,
что все бездомней надо мной
и все бездомней.*

*Не дай мне Бог еще хоть раз
прожить такое –
я помню все: твои глаза
и скорый поезд,*

*и притяжение окна,
где даль синеет,
насколь бездомней для меня,
настоль роднее.*

## СУСТРЭЧА З "ПЕРШАЦВЕТАМ"

Не кожны дзень дарує нам сустрэчы. А калі з іх можна ўзяць нешта карыснае, то гэта зусім добрая справа.

З такой нагоды адбылася сустрэча на філалагічным факультэце з загадчыцай аддзела крытыкі часопіса "Першацвет" Н.В.Кузьміч. Нягледзячы на сваю маладосць, гэта дзяўчына плённа працуе на ніве беларускай крытыкі . Падчас размовы са студэнтамі Наталля Васільеўна расказала, што ўяўляе сабой выданне. Некаторыя, каб пакпіць, зазначыла яна, называюць часопіс не "Першацвет", а "Пустацвет". Але нягледзячы на гэта мы пераканаліся, што ён мае вялікую будучыню, бо тут моладзь можа друкаваць не толькі свае вершы, але і апавяданні, эсэ, публіцыстычныя працы.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што вялікая колькасць студэнтаў зацікавіцца прапановай дасылаць свае творчыя работы ў рэдакцыю. Да гэтай сустрэчы многія з іх сумняваліся ў сваіх здольнасцях, але, на мой погляд, Наталлі Васільеўне ўдалося надаць смеласці студэнтам і накіраваць іх на творчы шлях.

**Вераніка ЖАРАНКОВА,
студэнтка 1-га курса філалагічнага факультэта.**

**Станислав ГАЛКОВСКИЙ,
студент 2-го курса физического факультета.**

### ЧИТАТЕЛЬ

*Я не пишу романы о любви,
Не сочиняю нежные сонеты,
Меня не вспомнят популярные поэты,
Не посвятят посмертные стихи.
В учебнике не будет черных сносок
О моих личных и общественных делах,
И мой многострадальных прах
Спокойно будет спать под сенью досок.
И именем моим не назовут
Забрызганные грязью перекрестки,
И в храмах на сырой известке
Мой лик венцом не обведут.
Я буду не известен в миллионах,
Я буду лишь один из них.
И мой многострадальный стих
Не засияет в Нобелевских кронах.
Я буду неизучен для страны.
Я буду нераскопан для науки,
Мои натруженные руки
Не сотворят Давида из скалы.
И где же первые возьмутся,
Когда вторым не буду я,
Пусть участь скорбная моя
Им позволяет оглянуться.
И кто такие Пушкин и Рабле?
Без нас, без миллионоликих.
Лишь наши восхваляющие крики
Их жизнь увековечат на земле.
Я не надену терновый венец
В своей прекрасной неизвестной жизни,
Любя и радуясь, живя в своей Отчизне,
Я – зритель, я – читатель, я – творец.*

На карце садружнасці

*Па рашэнню ЮНЕСКА 2000 аб'яўлены годам 1500-годдзя Туркестана — горада-помніка Старажытнага Усходу.*




# 1500 ГАДОЎ ГОРАДУ ТУРКЕСТАНУ

Горад заснаваны ў V стагоддзі на перакрыжаванні караванных дарог уздоўж Вялікага Шаўковага шляху. Дасягнуў росквіту ў XII стагоддзі, калі ў ім працаваў паэт Хаджа Ахмед Ясаві. Ён стаіць у адным радзе з такімі мысліцелямі, як Нізамі, Наваі і Хафіз. "Вершы мудрасці" Ясаві папулярныя да гэтага часу. Пахаваны ён у Туркестане ў 1167 годзе ва ўзведзеным для яго маўзалеі. У 1395-1399 г.г. па загаду магутнага Цімура маўзалей быў перабудаваны і набыў грандыёзны выгляд, які захаваўся па сённяшні дзень.

У кнізе "У патоку гісторыі" прэзідэнт Н.А.Назарбаеў адзначае: "Маўзалей Х.А.Ясаві стаў сімвалам казахскай дзяржаўнасці, які ў больш позні час выконваў ролю агульнанацыянальнага пантэона".

У XV-XVIII стагоддзях Туркестан быў стаўкай валадароў Казахскага ханства. Пры раскопках горада Атрара былі знойдзены адчаканеныя ў Туркестане медныя манеты канца XVI — пачатку XVII стагоддзя.

Адной з першых, хто ўступіў у дыпламатычныя кантакты з Казахскім ханствам, была Маскоўская дзяржава пры Вялікім князю Васілю III. Паступова сфарміраваўся саюз Расійскай і Казахскай дзяржаў, што дало магутны штуршок культурнаму і эканамічнаму развіццю Казахскага ханства.

Першы казахскі вучоны, асветнік-дэмакрат, гісторык, этнограф і фалькларыст Чокан Валіханаў нарадзіўся ў 1835 г. у сям"і ўнука хана Аблая. Ён закончыў у 1853 г. Омскі кадэцкі корпус, удзельнічаў у экспедыцыях у Сярэднюю Азію і Кітай. У 1858 г. у Кашгары сабраў матэрыялы па этнаграфіі Усходняга Туркестана і гісторыі Алтышара. У Пецярбургу Валіханаў пазнаёміўся з прадстаўнікамі перадавой інтэлігенцыі — Г.Н.Патаніным, А.Н.Бекетавым, Ф.М.Дастаеўскім.

У 1867 г. было ўтворана Туркестанское генерал-губернатарства. Горад стаў хутка расці. Сёння Туркестан перажывае другую маладосць. Пабудаваны комплекс студэнцкага гарадка Міжнароднага казахска-турэцкага Універсітэта імя Хаджы Ахмеда Ясаві. Юбілей Туркестана стаў у Казахстане галоўнай культурнай падзеяй канца XX ст.

**Аляксандр САКАЛОЎ, студэнт гр. ЭК-11 геолага-геаграфічнага факультэта.**




*На здымках:* паштовая марка "Маўзалей Ясаві", СССР, 1989 г.; фрагмент паштовага канверта, прысвечана Валіханаву, СССР, 1989 г.

**Арыгіналы ў калекцыі аўтара.**

Афіцыйны аддзел

# ЗА ДЫСЦЫПЛІНУ І ПАРАДАК

*Загадам па універсітэту ад 8 лістапада г.г. "Аб узмацненні кантролю за арганізацыяй дзяжурства ў карпусах і інтэрнатах" у адпаведнасці з функцыянальнымі абавязкамі работнікаў універсітэта і ў мэтах забеспячэння кантролю над выкананнем правілаў унутранага распарадку, арганізацыі выхаваўчай работы, узмацнення персанальнай адказнасці адміністрацыі, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў за захаванасць матэрыяльных каштоўнасцей і падтрыманне належнага парадку ў карпусах, а таксама для ўмацавання дысцыпліны студэнтаў, актывізацыі арганізацыйнай і выхаваўчай работы ў інтэрнатах прадугледжаны наступныя меры і дзеянні.*

У вучэбных карпусах і інтэрнатах арганізоўваюцца дзяжурствы адміністрацыі, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, загадчыкаў кафедр, прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў. Пастаянны кантроль за іх ажыццяўленнем ўскладзены на першага прарэктара А.П.Кармазіна.

Адказнасць за ўзмацненне выхаваўчай работы ва універсітэце нясе прарэктар па культурна-выхаваўчай рабоце А.В.Лысянкоў. У прыватнасці, пастаўлена задача ўдасканалення выхаваўчай работы сярод студэнтаў і аспірантаў, якія жывуць у інтэрнатах, павышэння ролі намеснікаў дэканаў па выхаваўчай рабоце, куратараў студэнцкіх груп. Распрацоўваюцца таксама Палажэнні аб службе кантрольна-прапускнога рэжыму універсітэта і АМОДа з размежаваннем абавязкаў. Павышаны патрабаванні па ўзаемадзеянню са службамі кантрольна-прапускнога рэжыму і маладзёжнага атрада дзяжурных выкладчыкаў вучэбных карпусоў.

Дэканы факультэтаў абавязаны забяспечваць дзяжурства студэнтаў і выкладчыкаў у вучэбных карпусах па графіку, загадчыкі кафедр — узмацніць кантроль за захаванасцю маёмасці.

Забараняецца курэнне ва ўсіх вучэбных карпусах, у тым ліку і на ганку. У адваротным выпадку гэта будзе расцэньвацца як грубае парушэнне правілаў унутранага распарадку.

Узмацняюцца таксама патрабаванні да студэнтаў, якія прапускаюць заняткі без уважлівых прычын. Гэта адлюстравана ў загадзе па універсітэту ад 23 лістапада г.г., які рэгламентуе вынясенне дысцыплінарных спагнанняў студэнтам дзённай формы навучання за парушэнне вучэбнай дысцыпліны. За 20 прапушчаных вучэбных гадзін студэнт атрымлівае заўвагу, за 40 гадзін — вымову з паведамленнем бацькам і прафкому студэнтаў. Калі сума прапушчаных гадзін заняткаў складзе 60, прагульшчык будзе адлічаны з універсітэта. Аб гэтым папярэдне паведамляецца яго бацькам з улікам думкі прафкома студэнтаў, а адлічэнне студэнтаў, якім яшчэ не споўнілася 18 год, праходзіць са згоды камісіі па справах непаўналетніх.

Дысцыплінарнае спагнанне (заўвага, вымова) студэнту аб'яўляецца дэканам факультэта.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

—радыёфізікі і электронікі — асістэнта;
—фізіялогіі чалавека і жывёлін — прафесара;
—фізвыхавання і спорту — старшага выкладчыка;
—педагогікі — старшага выкладчыка;
—спартыўных дысцыплін — старшага выкладчыка (замест няправільна ўказанай не па віне рэдакцыі ў папярэднім нумары газеты кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры).

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая,104.

**РЭКТАРАТ.**

ДА ЎВАГІ АБІТУРЫЕНТАЎ — 2001

## МАГЧЫМАСЦЬ ПАСТУПАЦЬ АДНАЧАСОВА Ў НЕКАЛЬКІ ВНУ АТРЫМАЮЦЬ АБІТУРЫЕНТЫ З 2001 ГОДА

Такое рашэнне прынята ў Міністэрстве адукацыі Беларусі.

У час мінулай прыёмнай кампаніі былі факты, калі абітурыенты спрабавалі здаваць аднachасова экзамены ў розныя ВНУ. Аднак згодна з існуючым цяпер нарматыўным актам, гэта лічыцца парушэннем правілаў прыёму. З такой сітуацыяй катэгарычна не згодны акадэмік Ігар Валатоўскі, які ўзначальвае Дзяржаўную камісію па кантролю за ходам уступных экзаменаў. На яго думку, паступіць адразу ў дзве ВНУ могуць толькі таленавітыя хлопцы і дзяўчаты, і ім трэба даць такую магчымасць. Згодны з ім і міністр адукацыі Васіль Стражаў. Ён адзначыў, што Беларусь цяпер — адзіная краіна ў СНД, не гаворачы ўжо аб усходняй Еўропе, дзе такое права абмежавана.

## ЭКЗАМЕН ПА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ БУДЗЕ АБАВЯЗКОВЫМ ДЛЯ ПАСТУПЛЕННЯ ВА ЎСЕ ВНУ РЭСПУБЛІКІ

Як пастанавіла калегія Міністэрства адукацыі, ён будзе паступова ўводзіцца ў структуру ўступных экзаменаў, пачынаючы з 2001 года.

Дарэчы, у час мінулай прыёмнай кампаніі станоўчыя веды па замежнай мове прадэманстравалі 64 працэнты абітурыентаў. І многія рэктары ВНУ лічаць, што гэты экзамен, калі будзе абавязковым, адаб'ецца на выніках прыёму не самым лепшым чынам. Асабліва гэта датычыцца выпускнікоў сельскіх школ і "мэтавікоў". Згодны з імі і міністр адукацыі Васіль Стражаў. Паводле яго слоў, выключэнне будзе зроблена менавіта для прэтэндэнтаў на мэтавую кантрактную падрыхтоўку.

**БЕЛТА.**

спорт спорт спорт спорт спорт спорт спорт

## ПЕРШЫНСТВО І КУБАК



У г.Полацку прайшло першынство Беларусі па пауэрліфтынгу і Кубак рэспублікі па жыме штангі лежачы, у якім прынялі ўдзел і нашы студэнты.

У спаборніцтвах за Кубак Беларусі мужчынская і жаночая каманды Гомельшчыны заваявалі ганаровыя ўзнагароды за перамогі.

Важкі ўклад у поспех мужчынскай зборнай унеслі студэнты факультэта фізічнай культуры Уладзімір Гадуноў і Пётр Клімкоў, якія сталі пераможцамі ў сваіх вагавых катэгорыях, а апошні ўстанавіў новы рэкорд Беларусі.

У спаборніцтвах за першынство рэспублікі жаночая зборная заняла першае месца, а мужчынская — другое, уступіўшы толькі сталічным спартсменам.

Прадстаўляў асілкаў Гомельшчыны на спаборніцтвах майстар спорту Уладзімір Галавач, які трэніруе нашых волатаў.

**В.МАРЧАНКА.**

## УДЗЯЧНАСЦЬ ЮБІЛЯРУ

Калектыў інтэрната №1 віншуе з 70-годдзем электрыка Івана Данілавіча Балігатава.

*Дарагі наш Іван Данілавіч!*
*Жадаем Вам моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця. Заставайцеся такім жа энергічным, руплівым на працоўным пасту яшчэ на доўгія гады.*

# У НОВЫ ГОД — З НОВЫМІ СТЫПЕНДЫЯМІ?

Ужо ў першай палове гэтага месяца Савет Міністраў можа прыняць праект пастановы, якая зацвердзіць новы парадак налічэння стыпендый студэнтам і навучэнцам навучальных устаноў Беларусі.

Праект падрыхтаваны ў мэтах забеспячэння сацыяльнай абароны моладзі, што вучыцца ў навучальных установах краіны, стварэння адзіных падыходаў у прызначэнні і выплаце стыпендый, упарадкавання стыпендыйнага забеспячэння. Памеры ўсіх відаў стыпендый будуць разлічвацца зыходзячы з параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацверджаных Законам "Аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на 2001 год", у абсалютных лічбах. Акрамя гэтага, што вельмі істотна, у праекце пастановы закладзены механізм перыядычнага перагляду памераў стыпендый. Праект пастановы таксама прадугледжвае выплаты стыпендый слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў ВНУ з ліку дзяцей-сірот, дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, дзяцей ваеннаслужачых, якія загінулі або атрымалі інваліднасць у час праходжання ваеннай службы.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта, кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту, доктару філалагічных навук **РОГАЛЕВУ Аляксандру Фёдаравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**

АГЧ і калектыў інтэрната №1 выказваюць глыбокае спачуванне культоргу **ВАРОНІНАЙ Валянціне Міхайлаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.


ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 678
Падпісана да друку 8.12.2000 г.